Дзяржаўная установа адукацыі
“Дзіцячы сад №2 г.п.Карэлічы”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ “ФАРМІРАВАННЕ АСНОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ Ў ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ (5-6 ГАДОЎ) СРОДКАМІ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ”

Гірыновіч Ірына Уладзіміраўна,
выхавальнік дашкольнай адукацыі
+375 33 349 74 08

2020

ББК 74.102

Ф 14

Рэкамендавана педагагічным сходам дзяржаўнай установы адукацыі “Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г.п. Карэлічы”

Складальнік: выхавацель дашкольнай адукацыі І.У. Гірыновіч

Рэцынзент: Л.П. Гоўша, загадчык дзяржаўнай установы адукацыі “Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г.п. Карэлічы”

**Ф 14 Фарміраванне асноўнацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту (5-6 гадоў) сродкамі музейнай педагогікі** /склад.: І.У. Гірыновіч. - Карэлічы: выдавецтва ДУА «Дашкольны центр развіцця дзіцяці г.п. Карэлічы» с.25

Змест вопыта накіраваны на рэалізацыю задач Вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі па напрамку “Сацыяльна-маральнае і асобаснае развіццё» Змяшчае тэарэтычныя асновы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей старэйшага ўзросту, фрагмент перспектыўнага плана работы па фарміраванню асноў нацыянальнай самасвядомасці сродкамі музейнай педагогікі ў дзяцей старэйшай групы (5-6гадоў), фрагмент занятка па адукацыйнай вобласці “Дзіця і грамадства” для дзяцей старэйшай групы (5-6 гадоў), фрагмент даследчай працы “Такія розныя лялькі-матанкі”

Адрасуецца выхавацелям дашкольных устаноў, бацькам, усім, хто займаецца выхаваннем падрастаючага пакалення.

ББК 74.102
© І.У. Гірыновіч
Складанне , 2016
© дзяржаўная установа адукацыі
“Дашкольны цэнтр развіцця
дзіцяці г.п. Карэлічы”

ЗМЕСТ


1. ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЛОК

Актуальнасць_____ 5

Мэта, задачы вопыту_____ 6

2. АПІСАННЕ ТЭХНАЛОГІІ ВОПЫТУ

Этапы работы_____ 7

Выніковасць_____ 11

3. ЗАКЛЮЧЭННЕ_____ 13

4. ДАДАТАК_____ 14

5. СПІС ЛІТАРАТУРЫ_____ 24

## *1. Інфармацыйны блок*

За мінулыя гады адбыліся вялікія змены ў адносінах людзей да нашай гісторыі, пераацэнка маральных каштоўнасцей. “Беларусы ў сваей масе ведаюць сваю мову і сваю культуру нашмат горш, чым мову і культуру суседніх этнасаў” [6, с.7 ]. Нажаль, у наш час матэрыяльнае дамініруе над духоўным, а ўяўленні аб нацыянальных каштоўнасцяхў дзяцей часта бываюцьбеднымі і скажонымі.

“Адраджэнне Рэспублікі Беларусь як сувярэннай дэмакратычнай дзяржавы, станаўленне новага грамадства патрабуюць новых падыходаў да выхавання падрастаючага пакалення…” [4, с. 66].Таму адна з асноўных задач установ адукацыі на сучасным этапе - “фарміраванне грамадскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці” [1, с.26].

Самай вялікай праблемай у данным накірунку з'яўляецца разрыў сувязяў пакаленняў, адукацыйны працэс па-за культурна-гістарычнымі традыцыямі. Старадаўняя мудрасць нагадвае нам: «Чалавек, які не ведае свайго мінулага,не ведае нічога». У большай ж колькасці бацькоў, дзеці якіх пачынаюць наведваць нашу дашкольную установу, адсутнічае цікавасць да гісторыі і нацыянальнай культуры. Дзеці недастаткова валодаюць інфармацыяй аб жыцці і быце нашых продкаў, адсутнічае практыка выкарыстання прылад працы продкаў, ды і самі дарослыя не размаўляюць на беларускай мове, не чытаюць твораў беларускай дзіцячай літаратуры. Адсюль і беднасць уяўленняў аб нацыянальных каштоўнасцях у нашых выхаванцаў.

Старэйшы дашкольны ўзрост – важнейшы перыяд станаўлення асобы, калі закладваюцца асновы якасцей чалавека - грамадзяніна, развіваюцца ўяўленні дзяцей аб чалавеку, грамадстве і культуры. “Далучэнне дзяцей дашкольнага ўзросту да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў” [1, с.7]. - адна з самых галоўных задач выхавання і навучання ва ўстановах дашкольнай адукацыі. У дашкольны перыяд развіцця дзіцяці пачынаюць развівацца тыя пачуцці, рысы характару, якія нябачна ўжо звязваюць яго са сваім народам, сваёй краінай. “Этнічная культура, гістарычная спадчына і

культура продкаў выступаюць базавымі каштоўнасцямі для развіцця асобы”[9, с.26].

Лічу, што галоўная задача кожнага педагога - будаваць сваю працу так, каб у будучым дзеці захавалі тое, што зберaглі для іх продкі; фарміраваць актыўную сацыяльную пазіцыю бацькоў як асноўных удзельнікаў выхавання асобы дзіцяці, далучаць іх як паплечнікаў да фарміравання ў дзяцей пачуцця патрыятызму, любві і павагі да роднай мовы і культуры.

Велізарныя магчымасці ў вырашэнні дадзенага пытання, на маю думку, належаць музейнай педагогіцы. Менавіта праз яе існуе магчымасць фарміраваць патрыятычныя пачуцці і грамадзянскасць не на абстрактных ідэалах, а на дакладных прыкладах, на далучэнні выхаванцаў да гістарычнай і культурнай спадчыны малой радзімы. Толькі ведаючы свае карані, чалавек можа стварыць сваё светлае будучае. Музей нясе ў сабе найважнейшуюадукацыйную функцыю. Галоўны метадычны прынцып музейнай педагогікі супадае з галоўным прынцыпам каштоўнаснага асваення рэчаіснасці: «Каштоўнасцям нельга навучыць, каштоўнасці неабходна перажыць» [6,с.58].

Улічваючы сацыяльна-педагагічную значнасць вылучанай праблемы, прапаную вопыт, заснаваны на выкарыстанні сродкаў музейнай педагогікі для фарміравання асноў нацыянальнай самасвядомасці дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту (5-6 гадоў).

**Мэтай** сваёй дзейнасці лічу фарміраванне асноў нацыянальнай самасвядомасці дзяцей старэйшага ўзросту , якая выражаецца:

1) ва ўяўленнях аб дэкаратыўна-прыкладным мастацтве роднай краіны;
2) ва ўяўленнях аб тым, як жылі раней людзі на Беларусі,этнічных прыкметах беларусаў ;
3) у навыках разумення і самастойнага ўжывання беларускай мовы.

Для сябе я вылучыла тры этапы адукацыйнага працэсу. Кажны з этапаў меў свае задачы.

**Першы этап** (верасень). Задачы этапу: прааналізаваць літаратуру па фарміраванню асноў нацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей старэйшага ўзросту;удасканаліцьразвіваючае асяроддзе ў міні-музеі "Спадчына"; распрацаваць план работы на навучальны год; скласці картатэку гульняў, канспектаў і экскурсій; прааналізаваць фактычны ўзровень ведаў і ўменняў выхаванцаў.

**Другі этап** (кастрычнік-красавік).Задачы этапу: арганізаваць адукацыйную дзейнасці праз выкарыстанне сродкаў музейнай педагогікі; пашырыць веды бацькоў па дадзенай праблеме.

**Трэці этап** ( май).Задачы этапу: абагульніць вопыт, арганізаваць кантроль ведаў дзяцей і меркаванняў бацькоў; апісаць і распаўсюдзіць вопыт.

***2. Апісанне тэхналогіі вопыту***

**Вядучая педагагічная ідэя вопыту** заключаецца ў тым,што ў сучасных умовах развіцця грамадства адной з эфектыўных форм фарміравання асноў нацыянальнай самасвядомасці дзяцей старэйшага узросту з'яўляецца музейная педагогіка.

Фарміраванне асноў нацыянальнай самасвядомасці сродкамі музейнай педагогікі паспрыяе ўсведамленню дзецьмі адзінства свайго краю, роднага горада з жыццём усёй краіны.

**Апісанне сутнасці вопыту**

Нацыянальная самасвядомасць - сукупнасць уяўленняў, пачуццяў і ведаў чалавека аб сваёй прыналежнасці да пэўнай нацыі, а таксама аб сваім месцы і ролі ў жыцці роднага народа[4, с.35].

Шырокае разуменне сутнасці, мэт, задач, фактараў і структурных кампанентаў, якія ўваходзяць у паняцце нацыянальнай самасвядомасці, мае ў педагагічнай навуцы даўнюю традыцыю.

Адным з першых беларускіх мысліцеляў, які ў сярэдзіне дзевятнаццатага стагоддзя найбольш канкрэтна вылучыў тэму нацыянальнага выхавання, быў пісьменнік В.І. Дунін-Марцінкевіч. Зыходзячы з духоўнай спадчыны беларусаў,

увасобленай у жывым творчым слове народа, у яго песнях, прыказках і прымаўках, ён лічыў гэту спадчыну асновай развіцця нацыянальнага станаўлення чалавека.

Таленавіты педагог, глыбокі прыхільнік беларускай духоўнай традыцыі Я. Колас адзначаў цесную сувязь і ўзаемаабумоўленасць трывалага вывучэння асобай роднай мовы з яе нацыянальна-патрыятычнай выхаванасцю і паводзінамі [5, с.19].

У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі адзначана, што “фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці” ва ўстановах адукацыі ажыццяўляецца “на аснове культурных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа”.

Такія навукоўцы як С. А. Казлова, Е. І. Карнеева, З. Н. Маразюк, Э. К. Суслава пераканаўча даказваюць, што ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту магчыма фарміраванне станоўчых адносін да з'яў грамадскага жыцця пры ўмове адбору зместу ведаў і адпаведнай арганізацыі дзіцячай дзейнасці.

Я ўпэўнена, што фарміраванне асноў нацыянальнай самасвядомасці, любові і павагі да роднай мовы немагчыма без далучэння выхаванцаў да этнакультурнай спадчыны беларускага народа, у якой закладзены велізарны пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял. Самай эфектыўнай формай работы па рэалізацыі гэтай задачы лічу музейную педагогіку.

Яна, як навуковая дысцыпліна на стыку музеязнаўства, педагогікі і псіхалогіі, разглядае музей як адукацыйную сістэму, гэта значыць - здольная вырашаць адукацыйную, асветніцкую і выхаваўчую задачы. Музейная педагогіка стварае ўмовы для фарміравання ў выхаванцаў пазіцыі асабістай адказнасці за мінулае, сапраўднае і будучае, іх разумення і эмацыйна-маральнай ацэнкі, а значыць- вырашае задачу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

У выданнях даведачнага характару музеі звычайна тлумачацца як навукова-даследчыя і культурна-асветныя ўстановы, якія ў адпаведнасці са сваімі сацыяльнымі функцыямі ажыццяўляюць камплектаванне, улік,

захоўванне, вывучэнне і папулярызацыю помнікаў гісторыі, культуры, а таксама прыродных аб'ектаў. У міжнароднай практыцы звычайна выкарыстоўваецца вызначэнне, выпрацаванае Міжнародным саветам музеяў (ІКОМ) і ўключанае ў яго Статут ў 1995 г.: музей - гэта «пастаянная некамерцыйная ўстанова , якая знаходзіцца на службе грамадства і яго развіцця і адкрытая  для людзей, яна набывае, захоўвае, вывучае, папулярызуе і экспануе ў адукацыйных, асветніцкіх і забаўляльных мэтах матэрыяльныя сведчанні чалавека і навакольнага яго асяроддзя » [ 10, с.16].

Прынцыпы стварэння дзіцячага музея сфармуляваў у 20-я гады XX стагоддзя рускі педагог А. У. Зелянко. Ен лічыў, што дзіцячы музей павінен «падысці да дзяцей», каб яны загарэліся жаданнем ўбачыць, пачуць, паспрабаваць, а таксама здзейсніць уласныя адкрыцці і што-небудзь зрабіць сваімі рукамі. Музей далучае маленькага дзіцяці да свету агульначалавечых каштоўнасцяў, спрыяе развіццю ў дзяцей даследчай, стваральнай і пазнавальнай дзейнасці .

Музеі заўсёды былі і застаюцца захавальнікамі памяці.У музеі дзеці судакранаюцца з прадметамі – праўдзівымі сведкамі культурнай спадчыны народа, яго багацця. Гэта забяспечвае высокую эмацыянальнасць успрымання матэрыялу, доказнасць пры яго выкладанні, што робіць вучэбны працэс больш дзейсным.

Менавіта гэтыя асаблівасці сталі метадычнай асновай майго вопыту. Логіка фарміравання асноў нацыянальнай самасвядомасці вызначалася патрабаваннямі вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

На першым этапе сваёй дзейнасці  я пачынала  сваю работу па фарміраванню асноў  нацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей старэйшага ўзросту з  вывучэння нарматыўна - прававой базы і метадычнай літаратуры,

якая сёння дазваляе падабраць формы і метады работы, найбольш адпаведныя канкрэтным умовам работы  дашкольнай установы, пры гэтым апіралася  на асноўныя раздзелы і задачы вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

Адначасова пазнаёмілася з перадавым педагагічным вопытам выкарыстання музейнай педагогікі на старонках навукова-метадычнага часопіса “ Пралеска”.

Далей работа праходзіла пасродкам выкарыстання практычных, наглядных метадаў і планавання адукацыйнай дзейнасці.

Я прадоўжыла работу створанага раней ва ўстанове адукацыі міні-музея “Спадчына”. Разам з бацькамі папоўніла куфар з вырабамі беларускіх умельцаў вышытымі гладдзю і крыжыкам ручнікамі, абрусамі, сурвэткамі, даматканымі палавікамі. Для пашырэння ведаў аб беларускім нацыянальным адзенні афарміла альбомы “Беларускае нацыянальнае адзенне”, “Народная культура”, “Сялянскае адзенне”, “Адзенне салдата Вялікай Айчыннай вайны” (*дадатак 1).* Экспазіцыі міні-музея размясціла з улікам наступнай лагічнай стужкі: успрыманне - разуменне - абдумванне - замацаванне -прымяненне, усе экспанаты занесела ў каталог.Афарміла картатэку гульняў, міні-слоўнік тэрмінаў(*дадатак2*). Склала канспекты заняткаў і экскурсій (*дадатак3*).

Пры планаванні работы на год улічвала не толькі базу дадзеных міні-музея “Спадчына”, але Карэліцкага краязнаўчага музея. Быў складзены перспектыўны план навучання дзяцей старэйшай групы (5-6 гадоў) з выкарыстаннем музейнай педагогікі *( дадатак 4),* а таксамаплан работы гуртка “ Ткацкія напевы”.Пазнаёміла дзяцей з музейнай тэрміналогіяй , правіламі паводзін у музеі.

Вывучыла ўзровень ведаў і ўменняў выхаванцаў праз назіранні за дзейнасцю ў гульнях, гутарках, пад час заняткаў. Прыйшла да высновы, што дзеці не асведамляюць сваёй этнічнай прыналежнасці да беларускай культуры, не разумеюць беларускіх слоў і не валодаюць на патрэбным узроўні беларускай мовай . Апытанне “ Што я ведаю пра сваю Радзіму?” *( дадатак5*) паказала, што 12(89%) дзяцей не ведаюць прылад працы беларусаў , не называюць прадметы побыту , не арыентуюцца ў вырабах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вынікі анкетавання бацькоў ( *дадатак 6*) паказалі, што 11(84%) з іх не чытаюць дзецям творы на беларускай мове, не

знаёмяць дзяцей з вырабамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, толькі 1(5%) з адказаўшых на пытанні анкеты наведваюць з дзецьмі музей.

На другім этапе, пры арганізацыі адукацыйнай дзейнасці вялікую ўвагу надавала падрыхтоўцы юных экскурсаводаў, паколькі экскурсіі займаюцьвыключнае месца ў рабоце міні-музея. Перад экскурсіяй падрыхтоўвала дзяцей да ўспрымання матэрыялу: тлумачыла значэнне новых слоў, працавала над развіццём культуры маўлення і арганізатарскіх здольнасцей.Дзеці з задавальненнем выконвалі ролю экскурсаводаў унашым музеі, праводзілі экскурсіі для дзецей малодшых груп і бацькоў*( дадатак 7).*У правядзенні экскурсій удзельнічалітаксама няўпэўненыя ў сабе дзеці і дзеці з асаблівасцямі у развіцці, што садзейнічала развіццю іх самастойнасці і павышэнню самаацэнкі.У выніку праведзенай работы нашы выхаванцы пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення прадметаў экспазіцый музея, спосабах дзеяння з імі, пашырыліся ўяўленні дзяцей аб побыце сялян у даўніну, папоўніўся слоўнікавы запас.

На занятку гуртка “Ткацкія напевы”, кіраўніком якога я з’яўлялася, дзеці знаёміліся з ніткамі, вучыліся асновам ткацтва,стваралі свае вырабы. Такім чынам яны далучаліся да вытокаў народнай культуры , у іх фарміраваліся элементарныя ўяўленні аб сродках ручнога ткацтва. У выніку працы ў музеі з’явілася выстава “ Чароўныя нітка” (*дадатак8).*

Праводзячы з выхаванцамі гутаркі, заняткі, сустрэчы, гасцёўні, экскурсіі, выставы, майстэрні і відэапрэзентацыі, я імкнулася да таго, каб кожная з гэтых форм музейнай педагогікі мела свой уплыў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці дзяцей.

Атрыманыя на занятках веды знаходзілі адлюстраванне ў сюжэтна-ролевых гульнях “Крама сувеніраў”, “У ганчарнай майстэрні”, “Музей народнага мастацтва”. Веды назваў і прызначэння прадметаў народнага побыту дзеці асвойвалі і замацоўвалі з дапамогай розных дыдактычных гульняў: «Вызначы час года і свята», «Адгадай, якое свята», «Беларускія

рамёствы», «Цудоўны куфэрак». «Народныя промыслы», «Беларускі нацыянальны арнамент», «Што змянілася?» і іншыя .

Для больш падрабязнага азнаямлення з жыццём продкаў нашага краю наведвалі Карэліцкі краязнаўчы музей. Атрыбуты і традыцыі правядзення беларускіх народных святаў, прылады працы сялян, беларускае нацыянальнае адзенне, фотаздымкі знакамітых землякоў - усё гэта дзеці змаглі не толькі ўбачыць сваімі вачыма, але і адчуць цікавыя расповяды музейных супрацоўнікаў ( *дадатак 9).*

У ходзе пошукава-даследчай работы пазнаёміла дзяцей з беларускай лялькай-матанкай. Мною быў праведзены занятак па вырабу такіх лялек , на якім дзеці даведаліся пра іх гісторыю, адметнасці і разнастайнасці, навучыліся самастойна іх вырабляць. Грэмяка Даша правяла сваю даследчую работу "Такія розныя лялькі-матанкі", якая была прадстаўлена на Х раённай вучэбна-даследчай канферэнцыі " Путь к познанию"*(дадатак 10).* Даша таксама ўдзельнічала ў раённым конкурсе "Праменьчыкі надзеі" з работай "Велікодная радасць"*(дадатак 11).*

Рэалізацыя задач па фарміраванню асноў нацыянальнай самасвядомасці была б не эфектыўнай без далучэння да яе бацькоў. Кансультацыі «Народная мудрасць у выхаванні дзяцей», «Сакрэты і таямніцы старых рэчаў», віктарына "Ці ведаеце вы свой горад", экскурсія "Я люблю сваю хату", выставы «Лялькі нашых продкаў*"(дадатак12)*"Герб сям'і", "Карціны, падораныя прыродай" *(дадатак13)*, музейныя сустрэчы - вечарыны "Па ручніку, што з роднай хаты, мы пазнаём сваю Радзіму", "Скарбы роднага краю", "Сімволіка і функцыі народнага касцюма",фотавыставы «Сямейны альбом», конкурсы, святы - гэта мерапрыемствы, якія дапамаглі пашырыць веды бацькоў па дадзенай праблеме*(дадатак14).*

Сем'і маіх выхаванцаў удзельнічалі ў зборы інфармацыі, падборы матэрыялу для правядзення заняткаў і экскурсій. Бабулі ўдзельнічалі ў правядзенні заняткаў: паказвалі свае вырабы, расказвалі аб іх гісторыі. Маці

выхаванцаў нашай групы Баранава А.Г. правяла майстар-клас для бацькоў "Выраб гульнявой лялькі-матанкі Зайчык на пальчык *" (дадатак15 ).*Усе гэта аб'яднала дзяцей і бацькоў, стварыла ўмовы для творчых зносін, супрацоўніцтва і развіцця дзяцей, садзейнічала фарміраванню цікавасці да нацыянальнай культуры не толькі ў дзяцей, але і ў бацькоў.

На трэцім этапе вынікавасць вопыту выяўлялася з дапамогай маніторынгадынамікі ўяўленняў дзяцей па авалоданню беларускай мовай і культурай маўленчых зносін , уяўленняў па адукацыйнай вобласці " Дзіця і грамадства" на пачатак і на канец навучальнага году . Быў адзначаны рост ведаў дзяцей, з якімі на працягу я году займалася з выкарыстаннем сродкаў музейнай педагогікі , гэта сведчыць аб станоўчых выніках.

Мне вельмі прыемна бачыць гэтыя вынікі. Мае выхаванцы маюць ўяўленні аб дэкаратыўна-прыкладным мастацтве роднай краіны,аб жыцці людзей на Беларусі ў былыя часы,этнічных прыкметах беларусаў.Дзякуючы працы ў музеі ў якасці экскурсаводаў дзеці самі пазнаёміліся з жыццём нашых продкаў і з цікавасцю перадаюць свае веды дарослым і дзецям, умеюць адрозніць розныя віды беларускіх народных цацак. Пашырыўся слоўнікавы запас дзяцей, яны разумеюць і самастойна ўжываюць беларускую мову ў паўсядзённым жыцці.

Пасля атрымання дадзеных аб вынікавасці вопыту, яго ідэі абагульнены і прадстаўлены педагагічнаму калектыву, трансляваліся на раённых метадычных аб'яднання.

### *2. Заключэнне*

Аналіз працэсу і вынікаў вопыту фарміравання асноў нацыянальнай самасвядомасці дзяцей старэйшага дашкольнага ўзростусродкамі музейнай педагогікі дазваляе зрабіць наступныя вынікі:

-прад'яўленная праблема актуальна і патрабуе сістэмнай работы;

-станоўчыя вынікі фарміраванняасноў нацыянальнай самасвядомасці дзяцей старэйшага дашкольнага могуць быць дагягнуты з дапамогай выкарыстання сродкаў музейнай педагогікі;




- вынікі маёй работы апраўданы высокімі паказчыкамі ведаў выхаванцаў маёй групы .

Фарміраванне асноў нацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей – адказная і складаная задача, вырашэнне якой у дашкольным дзяцінстве толькі пачынаецца. Упэўнена, што планамерная, сістэматычная работа, выкарыстанне разнастайных сродкаў музейнай педагогікі , агульныя намаганні ўстановы адукацыі і сям'і дадуць станоўчыя вынікі і стануць грунтоўным падмуркам для далейшай работы па патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення. Прыйдзе час, і сённяшнія дашкольнікі будуць вызначаць будучыню роднай Беларусі. Таму так важна ўжо зараз звярнуць увагу на фарміраванне ў падрастаючага пакалення нацыянальнай самасвядомасці, выхаванне асобы з актыўнай жыццевай пазіцыяй, у цэнтры якой будзе усведамленне ўласнай адказнасці за лёс Радзімы.

Веру, што кожнаму нашаму выхавацелю па сілам данесці да сваіх выхаванцаў частку ведаў аб родным краю, аб гісторыі беларускага народу, яго культуры, абрадах і традыцыях, палепшыць авалоданне беларускай мовай з дапамогай сродкаў музейнай педагогікі.

***Дадатак 1*** ***Дадатак 2***



*Дадатак 3*

**Падарожжа ў мінулае адзення**

Фрагмент занятка па адукацыйнай вобласці “Дзіця і грамадства”

для дзяцей старэйшай групы (5-6 гадоў)

**Праграмны змест:**фарміраваць уяўленні дзяцей пра гісторыю ўзнікнення тканіны пра ткацтва, вышыўку; пашыраць уяўленні аб беларускім арнаменце, спосабах яго стварэння; узбагачаць слоўнік назвамі прадметаў побыту: спадніца, сукенка, лапці, калаўрот; выклікаць пачуццё гонару за таленавітых майстроў нашай краіны, цікавасць да народнай творчасці.

**Матэрыял і абсталяванне**: аўдыёзапіс беларускай народнай музыкі, прэзентацыя ”Этапы апрацоўкі лёну”, альбом “Беларускі нацыянальны касцюм”.

**Ход занятка**

*Гучыць аўдыёзапіс беларускай народнай музыкі.*

**Выхавацель** Дзеці, сёння мы адправімся ў падарожжа ў мінулае адзення. Скажыце,як мы назавемадзенне, у якоеапранута я? (беларускі народны касцюм). Мы прывыклі да гатовайтканіны, адзеннекупляем у краме. А нашыпродкіўсёвыраблялісваімірукамі.Тамуадзенненазываласязрэбнае, г. зн. вытканае дома.Каб атрымаць палатно – даматканую тканіну, трэба было шмат папрацаваць. (Прэзентацыя ”Этапы апрацоўкі лёну”).

**Народная гульня “Вузельчык”**

**Выхавацель**Адгадайце, калі ласка, загадку.

Па хаце скачу, нітку кручу.

Чымбольшкручуся, тым большстанаўлюся. (Верацяно)

*Выхавальнік дэманструе дзецям верацяно з ніткамі.*

Нітка наматваецца на верацяно. Чымбольшнаматваеццанітак, тымтаўсцейшымстановіццаверацяно. Паглядзіце, шторобіцьверацяно? (круціцца, верціцца). Вось за гэта яго і назвалі верацяном.

**Практыкаванне «Круцім верацяно».**Уявіце, што вы сядзіце за прасніцай і круціце верацяно спачатку адной, а пасля абедзвемя рукамі адначасова.

Пазней з'явіліся калаўроты. Паглядзіце як працуе калаўрот: пальчыкамі выцягваецца воўна і круціцца нітка. Быў час, калі ў вёсцы ўсе былі пападухамі: маці вучыла прасці дачку, бабка – унучку.З нітак на спецыяльных станках, кроснах ткалі палатно. Зімой яго вымаражвалі, вясной выветрывалі, на сонцы высушвалі. Затым адбельвалііі шылі з яго адзенне, ручнікі, простыні, абрусы.

**Разглядванне альбома "Беларускі нацыянальны касцюм".**Кашулю часцей за ўсё ў нашай краіне вышываюць чорным па белым. Манжэты і каўнер упрыгожвалі арнаментам. У старажытнасці людзі лічылі, што менавіта праз гарлавіну, ніз і рукавы можа залесці нячыстая сіла. Арнамент як бы ахоўваў чалавека, асабліва жанчыну, ад нячысцікаў.Спаднічка ў клетачку ці палоску. Паверх спаднічкі павязваўся фартушок.Фартух часцей за ўсё упрыгожваўся геаметрычным арнаментам, у аснове якога заўсёды ляжаў квадрат і трохвугольнік.На галаву часцей завязвалі хусціну ці надзявалі вяночак.Хлопцу варта апрануць вышываную кашулю і падпяразацца тканым паяском, на галаву надзець саламяны капялюш. Але беларусы любілі не толькі працаваць, але і павесяліцца. І мы з вамі давайце пагуляем.

**Гульня "Міхасік"**

## Экскурсія "Я люблю сваю хату"

**Мэта:** фарміраваць уяўленні дзяцей аб побыце сялян мінулых стагоддзяў, выхоўваць павагу да працы і творчасці людзей, беражлівыя адносіны да рэчаў нашай спадчыны, любоў да сваёй Радзімы і роднай мовы

***Выхавацель:*** Добры дзень, рады вітаць Вас ў музеі “Спадчына”. Дзякуючы намаганням выхавацелей, бацькоў і дзяцей, сабраны рэчы побыту жыхароў нашага раёна як даўнейшых часоў, так і рэчаў цяперашняга часу.

***1-ы экскурсавод***

Трэба ведаць –сэрца просіць,

Як дзядам, бацькам жылося...

Як сахой даўней аралі,

Як з сявалкі збожжа-зерне

Рассявалі чорнай жменяй...

***2-і экскурсавод***

Тэба ведаць, што зазналі,

Як на пана працавалі...

Трэбаведаць і пратое,

Апраналішто? Якое?..

*ПятрусьБроўка.*

*«Наш музей»*

***3-і экскурсавод***

Наш музей нагадвае хату, ў якой жылі нашы продкі. Звычайна непадалёку ад парога насупраць вакна размяшчалася печ. Без яе нельга было уявіць сялянскую хату.

А вось і печ ласкавая матуля,

Што кожнага пяшчотаю атуліць,

Сустрэне ўсіх пяшчотна ля дзвярэй.

Сагрэе і прастуду адбярэ.

***4-ы экскурсавод***

Заўсёды ля печы гаршкі, чыгункі,

Мурзатыя, пузатыя працаўнікі.

Дровы палілі, варылі, кармілі.

Апобач гаршчэшнік. Ён быццам конь,

Носяць гаршкі, чыгункі ў агонь.

А тут качарга – крывая нага.

Золата ў скрыню грабе як мага.

Але ж не сапраўднае золата гэта.

Астыў вугалёк – пачарнела манета.

***5-ы экскурсавод***

Самым распаўсюджаным і найбольш прадстаўленым у нашым музеі з'яўляецца збан, ці гладыш, як яго яшчэ называюць.

Колькі год яму? Хіба ўспомніш?

Уталяў ён голад не раз:

Сырадоем бываў напоўнен,

Дастаўляў на пакосы квас.

***Выхавацель:*** Гліняны посуд: *збаны, глякі, міскі, кубкі*– неабходныя рэчы ў гаспадарцы, бо ў іх добра захоўваліся малако, смятана, тварог, масла, сала топленае... На жаль, няма ў нас ганчарнага круга, пры дапамозе якога рабіліся збаны, глякі, што маюцца ў нашым музеі. Ганчарная справа з'явілася на Беларусі ў X ст. і дайшла да нашых дзён.

***6-ы экскурсавод***

Ёсць у нас і *серп,* без якога немагчама было сабраць ураджай.

Не адзін нажаў снапок

Востры, зублены сярпок.

***Дадатак 4***

**Фрагмент перспектыўнага плана работы па фарміраванню асноў нацыянальнай самасвядомасці сродкамі музейнай педагогікі ў дзяцей старэйшай групы (5-6гадоў)**

| Тэма тыдня<br><br>тыдня | Формы работы | Месца правядзенн я | Праграмныя задачы |
|---|---|---|---|
| **Верасень** | | | |
| Школа | Экскурсія<br><br>“Школа мінулага” | Карэліцкі краязнаўчы<br><br>музей | Пазнаёміць з тым, у якіх школах вычыліся людзі раней, фарміраваць навыкі паводзін у грамадскіх месцах, выхоўваць пачуццё годнасці за дасягненні беларускай школы |
| Сям’я | Выстава<br><br>“Бабулін куфэрак “ | Міні-музей<br><br>“Спадчына” | Фарміраваць уяўленні дзяцей аб прадметах побыту, якімі карысталіся бабулі раней, узбагачаць беларускі слоўнік |
| Белару ская народн ая творча сць | Эксурсія<br><br>“Творчасць нашых продкаў” | Карэліцкі краязнаўчы<br><br>музей | Фарміраваць уяўленні аб дэкаратыўна-прыкладным мастацтве беларускага народу, этнічных асаблівасцях беларусаў |
| **Кастрычнік** | | | |
| Праца калгас нікаў | Музейны занятак<br><br>“ Адкуль хлеб на стале?” | Карэліцкі краязнаўчы<br><br>музей | Фарміраваць уяўленні аб тым, як людзі раней здабывалі хлеб, пазнаёміць з героямі працы Карэліцкага раёну, выхоўваць паважлівыя адносіны да хлеба як прадукта працы многіх людзей |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Мэбля | Віртуальная экскурсія “ Наша мэбля: мінулае і сучаснае” | Міні-музей “Спадчына” | Фарміраваць уяўленні аб гісторыі ўзнікнення мэблі, пазнаёміць з паняццямі зэдлік, лаўка, ложак; прадэманстравацьвідэапрезентацыі “Мэбля Мірскага замку”, “Вырабы фабрыкі”ПінскДрэў” |
| **Лістапад** | | | |
| Адзенне, абутак | Музейны занятак “Падарожжа ў мінулае адзення" | Міні-музей “Спадчына” | Фарміраваць уяўленні дзяцей пра гісторыю ўзнікнення тканіны, пра ткацтва, вышыўку; пашыраць уяўленні аб беларускім арнаменце, спосабах яго стварэння; узбагачаць слоўнік назвамі прадметаў побыту: спадніца, сукенка, лапці, калаўрот; выклікаць пачуццё гонару за таленавітых майстроў нашай краіны, цікавасць да народнай творчасці |
| Беларускія цацкі | Майстэрня ганчароў “Вясёлыя свістулькі” | Міні-музей “Спадчына” | Развіваць устойлівую цікавасць да твораў мастацтва, знаёміць дзяцей з цацкамі-світулькамі ,іх гісторыяй і вырабам; выхоўваць эстэтычны густ і беражлівыя адносіны да цацак |
| Прадукты харчавання | Музейны занятак з выкарыстаннем відэапрезентацыі “ Наш другі хлеб” | Міні-музей “Спадчына” | Фарміраваць уяўленні аб стравах беларускай кухні з бульбы; паказаць, як карысталіся печчу для прыгатавання бульбы нашы продкі; узбагачаць беларускі слоўнік назвамі страў |
| **Студзень** | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Коляд ы | Гасцёўня " Ля каляднай зоркі" | Карэліцкі краязнаўчы музей | Фарміраваць уяўленні аб народным свяце Каляда, пазнаёміць з традыцыямі і атрыбутамі свята, выхоўваць цікавасць да народных святаў і традыцый |
| Рэспуб ліка Белару сь | Тэматычная гутарка " Нашы славутыя землякі" | Карэліцкі краязнаўчы музей | Фарміраваць цікавасць да гісторыі роднага краю, уяўленні аб ролі славутых землякоў у гістарычным станаўленні Рэспублікі Беларусь, выхоўваць пачуццё павагі да роднага краю |

***Дадатак 5***

**Апытанне " Што я ведаю пра сваю Радзіму?"**

1.У якойкраіне ты жывеш?

2. Што ты ведаешпра Беларусь?

3. Ціўмееш ты размаўляць па-беларуску?

4.Як называецца пасёлак у якім ты жывеш?

5. Якіяпомнікі, гістарычныямесцыёсць у тваімпасёлку?

6. Як называюцьлюдзей, якіяжывуць у Беларусі?

7. Якія ты ведаешнародныясвяты, як яныадзначаюцца?

8.Назаві абутак нашых продкаў.

9.Што раней выкарыстоўвале замест шафы?

10. У чым варылі ежу, захоўвалі малако?

11.Назаві народных майстроў традыцыйных рамёстваў.

12. Якія беларускія народныя цацкі ты ведаеш?

13. З чаго зроблены беларускія народныя цацкі?

14. Як з імі трэба гуляць?

15.Як ўпрыгожаны часткі беларускага адзення? Рукавы, каўнер?

16. Ці умееш ты рабіцьбеларускую народную цацку?

***Дадатак 6***

**Анкета для бацькоў**

1. Ці гаворыце вы дзецямабмінулымісучасным нашагапасёлка, краіны?
2. Ці чытаеце вы дзецям беларускіяказкі, апавяданні?
3. Ці знаёміце вы дзяцейзгістарычна-культурнымі каштоўнасцямі пасёлкаікраіны?
4. Ці наведваеце вы з дзецьмі музеі?
5. Ці былі вашыя дзеціўіншых гарадахБеларусі?
6. Ці падтрымліваеце вы ў сям`ібеларускіятрадыцыііабрады?
7. Ці знаёміце вы дзяцей з дэкаратыўна- прыкладным мастацтвам?

***Дадатак 7***







***Дадатак 8***



*Дадатак 9*



*Дадатак 10*

Фрагмент даследчай працы

ТАКІЯ РОЗНЫЯ ЛЯЛЬКІ-МАТАНКІ

**Аб'ектдаследавання**: лялькі-матанкі.

**Прадметдаследавання:**разнастайнасць лялек-матанак.

**Мэтамайгодаследавання:**даведацца, чамулялькі-матанкіназываюцца па-рознаму.

Згодна з гэтаймэтыбыліпастаўленынаступныязадачы:

- даведацца, якіялялькіназываюццаматанкамі;
- пазнаеміцца з асаблівасцямі розных відаў лялек-матанак;
- навучыццавырабляць ляльку-матанкусваімірукамі.

**Гіпотэза:** я выказала здагадку, штоназва лялек-матанак залежыць ад іхвонкавагавыгляду.

**Метады і прыемы:**

• звярнуцца да прабабулі і кіраўніка міні-музея;

• пачытаць кнігі;

• атрымаць інфармацыю з Інтэрнэта;

• правесці даследаванні;

• зрабіць высновы.

Практычная значнасць даследавання: матэрыялы работы можна выкарыстоўваць пры правядзенні заняткаў па адукацыйнай вобласці «Дзіця і грамадства», адукацыйны кампанент «Самаробны свет», а таксама пры правядзенні экскурсій у міні-музеі « Спадчына».

***Дадатак11Дадатак12***





***Дадатак13***




***Дадатак14***



***Дадатак15***





## Спіс літаратуры

1. Адукацыйныя стандарты. Дашкольная адукацыя.-Мінск, 2013.-29с.

2. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі.- Мінск: Национальный институт образования, 2012.-415с.

3.Дубоўская, Л.В. Маленькія грамадзяне вялікай краіны / Л.В. Дубоўская.- Мазыр: Содействие, 2007.-216с.

4.Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13.01.2011г. № 243-39 (у рд. Законаў Рэспублікі Беларусь ад 04.01.2014 № 126-З)

5. Культуралогія: Энцыкл. давед./ Э. С. Дубянецкі; Маст. А. А. Глекаў. -Мінск.: БелЭн, 2003. -384 с.

6. Национальное самосознание и философия Беларуси : учебно-метод. пособие / Г. И. Малыхина [и др.]; под ред. Г. И. Малыхиной, В. И. Миськевича. - Мн. : БГУИР, 2012. – 170 с.

7.Пралыгіна, Н. В. Беларускамоўны дзеньу старэйшай групе: планаванне і арганізацыя работы / Н. В. Пралыгіна.-Мазыр: Содействие, 2012.-143с.

8.Рыжова,Н.А. Музейная педагогика в ДОУ/ Н.А.Рыжова. - Москва: Просвещение, 2012. - 136с.

9.Старжынская, Н.С., Дубініна, Д.М. Народная цацка – люстэрка культуры/ Старжынская Н.С. , Дубініна Д.М. – Мінск, 2014.-86с.

11. Юренева, Т. Ю. Музееведение/Т.Ю.Юренева.- М.: АСТ , 2008.- 222 с.

**ФАРМІРАВАННЕ АСНОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ Ў ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ (5-6 ГАДОЎ) СРОДКАМІ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ**

З вопыту работы

Адказны  за выпуск І.У Гірыновіч

Кампьютэрны набор І.У Гірыновіч  Дзяржаўная установа  адукацыі “Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г.п. Карэлічы” 231430 г. п. Карэлічы, зав. Савецкі, 8

Складальнік: выхавацель дашкольнай адукацыі І.У. Гірыновіч,

231430 г.п. Карэлічы, ул, Гастэла, д.19, кв. 5, тэлефон +375 33 349 74 08.